# МОЛАДЗЬ СВЕТУ ЗА ЛЁС ПЛАНЕТЫ Ў АДКАЗЕ




**16 верасня ў Маскве адкрыўся Сусветны форум салідарнасці моладзі і студэнтаў у барацьбе за нацыянальную незалежнасць і вызваленне, за мір**

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА і ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 28 (576) Субота, 19 верасня 1964 года. Год выдання XVII-ы Цана 1 кап.

## СВЯТА МІРУ І ДРУЖБЫ

Кожны год прыносіць змены ў жыццё народаў і краін. На месцы былых калоній і паўкалоній узнікаюць новыя незалежныя дзяржавы. Але барацьба на гэтым не заканчваецца. Заваяваўшы свабоду, народы гэтых краін змагаюцца за ўмацаванне эканамічнай і палітычнай незалежнасці. Нашы замежныя равеснікі ўсё больш пачынаюць разумець, што нельга аддзяляць барацьбу народаў за нацыянальную незалежнасць ад барацьбы за мір, за ўсеагульнае і поўнае раззбраенне.

Моладзі свету над сілу рашэнне такіх пытанняў, як умацаванне салідарнасці і адзінства дзеянняў моладзі і студэнтаў усіх краін у барацьбе за ліквідаванне рэштак каланіяльнай сістэмы, за нацыянальнае вызваленне і ўмацаванне незалежнасці, за хуткі эканамічны, сацыяльны і культурны прагрэс краін, якія вызваліліся ад каланіяльнай залежнасці, за дэмакратыю і мір ва ўсім свеце.

Каб перамагчы, трэба быць заўсёды разам. З асаблівай сілай гэты заклік гучыць зараз, калі ў сталіцы нашай Радзімы праходзіць Сусветны форум юнацтва. Моладзь свету клапоціцца за лёс нашай планеты, за лёс чалавецтва. Юнакі і дзяўчаты ўсіх краін заўсёды імкнуцца да дружбы. Яны разумеюць, што толькі на шляху дружбы і міру яна зможа вырашыць усе свае актуальныя праблемы.

*Ровесник мой, живешь ли ты*
*за морем*
*Иль на московской улице твой*
*дом,*
*Мы встретимся, поговорим,*
*поспорим*
*И непременно истину найдем.*

Так! Сябраваць моцна, па-сапраўднаму, па-студэнцку — так гавораць студэнты і нашага Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна, які шырока расчыніў дзверы для студэнтаў некалькіх замежных краін — Кубы, Польшчы, Манголіі, В'етнама, краін далёкага афрыканскага кантынента.

Выконваючы свой інтэрнацыянальны абавязак, наш універсітэт дапамагае ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў для гэтых краін. Студэнты-іншаземцы навучаюцца на сямі факультэтах універсітэта.

Жыццё замежных студэнтаў у нас ва ўніверсітэце змястоўнае і шматграннае. Усямерна дапамагаюць ім у авалоданні ведамі, у арганізацыі вучобы, адпачынку, працы партыйны камітэт, камітэт камсамола, інтэрнацыянальны клуб, камітэт «Дружба». Надоўга застануцца ў памяці студэнтаў універсітэта вечары, прысвечаныя нацыянальным юбілейным датам Кубы, В'етнама, краін Афрыкі. Гэтыя вечары ператварыліся ў вялікія мітынгі дружбы і салідарнасці моладзі ўсіх краін, студэнты якіх навучаюцца ў нас, у БДУ.

Добрай традыцыяй стала ў нас пасадка алеі «Дружба», пачатак якой быў пакладзены ў маі 1963 года. У алеі зараз 17 дрэў, што былі пасаджаны студэнтамі Кубы, В'етнама, Конга, Кеніі, Польшчы, Ганы, Гвінеі і іншых краін і, зразумела, беларускімі студэнтамі. Пасаджана дрэва ў гонар Фідэля Кастра. Пройдуць гады і наша алея дружбы будзе сімвалам вялікай салідарнасці студэнцтва і моладзі 60-х гадоў XX стагоддзя.

Адзінства і дружба юнакоў і дзяўчат усіх кантынентаў расце і мацнее з кожным днём. Цягерашняе юнацтва — гэта пакаленне стваральнікаў, якое ірвецца ў бой, каб будаваць, а не ваяваць! Патрабаванне ўсеагульнага і поўнага раззбраення, незалежнасці, свабоды, барацьба за мір — гэта перакананне вялізнай большасці моладзі, якая трымае экзамен на жыццёвую сталасць.

Г. Я. РЫЛЮК,
сакратар камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна.

## МЫ ПЕРАМОЖАМ!

Ад імя нашага калектыву, ад імя кубінскіх студэнтаў, якія прадстаўляюць кубінскі народ у Мінску, дазвольце павіншаваць вас з адкрыццём Сусветнага форума моладзі. На гэты форум у Маскве сабраліся юнакі і дзяўчаты з многіх краін пяці кантынентаў, якія змагаюцца за мір і дружбу, як і мы, кубінскія студэнты, як і наш народ. Востраў Свабоды імкнецца да дружбы з усімі народамі свету.

Мы шлём наша палымянае прывітанне ўсім удзельнікам форума.

Няхай жыве мір!

Няхай жыве дружба паміж народамі!

Радзіма або смерць! Мы пераможам!

КУБІНСКІЯ СТУДЭНТЫ ПАДРЫХТОЎЧАГА ФАКУЛЬТЭТА БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

## Дэвіз „Дружба і мірнае суіснаванне“

Дарагія таварышы!

Мы карыстаемся выпадкам, каб яшчэ раз выказаць нашу рашучасць і гатоўнасць выканаць абавязак студэнцкай моладзі — змагацца ўсімі сіламі, каб пакончыць з любымі праяўленнямі каланіяльнай агрэсіі і падрыўной дзейнасці імперыялістаў як у Афрыцы і Азіі, так і на ўсёй планеце.

Мы аб'ядноўваем свае намаганні пад лозунгам «Дружба і мірнае суіснаванне», каб назаўсёды пакончыць з жорсткім рэжымам каланіялізму і імперыялізму.

Ад імя студэнтаў Афрыкі, якія навучаюцца ў Мінску, заклікаем да адзінства і сумеснай работы назаўжды, заклікаем быць нястомнымі барацьбітамі за шчасце будучых пакаленняў.

Няхай наша сумесная вялікая праца набліжае мір і свабоду на ўсім зямным шары!

АФРЫКАНСКІЯ СТУДЭНТЫ, ЯКІЯ НАВУЧАЮЦЦА Ў БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

*Улетку студэнт аддзялення журналістыкі В. ЛУЦЭНКА пабываў у турысцкай паездцы ў Алжыры. Там сустрэў беларускіх юнакоў, якія дапамагаюць сваім братам у будаўніцтве новага жыцця. Вось і на гэтым здымку вы бачыце галоўнага механіка будоўлі ў гарах Вялікай Кабіліі студэнта БІІ Міхаіла Грыгор'ева (крайні справа) і лепшага шафёра, яго сябра з інстытута Канстанціна Хворака (у цэнтры) сярод алжырскіх юнакоў.*



## Мой новы сябар

Жазеф Нганду. Гэта наш сябар—кангалезец, студэнт 1-га курса аддзялення журналістыкі. Мы з першых дзён заняткаў ва ўніверсітэце неяк прывязаліся да яго, палюбілі гэтага юнака. Таварыскі і цікаўны, нядрэнна валодаючы рускай мовай, Жазеф стараецца пабольш даведацца пра нашу краіну, пра яе народ. І мы заўсёды прыходзім яму на дапамогу, растлумачваем тое, што яго цікавіць. І ў сваю чаргу цікавімся жыццём кангалезскага народа.

Не схаваю свайго пачуцця гонару і радасці, але, калі ўпершыню я пацісну ў руку Жазефа, мне здалося, што я пацісну ў руку ўсёй Афрыкі, яе народаў.

Г. КАРАБІЦКІ.

## *Там, дзе сінее Нарач*

Вялікай блакітнай чашай раскінулася сярод лясоў возера Нарач.

Сюды, у гэты цудоўны куток прыроды штогод прыязджаюць на практыку студэнты-біёлагі. Сёлета пабывалі тут і мы, цяпер ужо другакурснікі біяфака. Вясёлыя блакітныя домікі лабараторый, клуба, сталоўкі размясціліся на абрывістым беразе возера прама сярод дрэў. Рана пачынаецца працоўны дзень на біястанцыі. Толькі дакрануцца промні ўзыходзячага сонца да вады, да лодак, а на беразе ўжо жыццё ідзе поўным ходам. Яшчэ праз паўгадзіны ўсё заціхае на станцыі: ідуць у паходы групы. Але што гэта? З акна аднаго з домікаў чуваць чыйсьці адчайны голас: «Суэн, Суэн, каша прыгарае, што рабіць?». Гэта дзяжурныя па кухні рыхтуюць абед. Але вельмі ўжо спяшаліся і рана засыпалі макароны. Трэба клікаць «галоўнага». Фан Тхай Суэн — строгі дзяжурны. «Ай-ай, дзяўчаты, прыйдзецца чысціць бульбу!». Што зробіш, самі вінаватыя. А абедаць жа трэба ўсім!



У жаркі поўдзень вяртаюцца з лесу са «здабычай» марфолагі, з возера цягнуцца з поўнымі марылкамі мокрыя заолагі. Колькі ўражанняў! В'етнамскія дзяўчаты Сыонг, Там і Жанг чымсьці ўзбуджаны. «А мы ўпершыню пакаштавалі лясную земляніку! Смачна!».

Пасля абеду і адпачынку зноў за работу. Трэба аформіць сабраныя віды, запоўніць лацінскія назвы. Рыхтавацца можна і на палянцы (гл. здымак), на свежым паветры.

А ўвечары можна «паганяць» мяч, павесяліцца. З надыходам цемры ўсё сціхае. Толькі адна з груп мітусіцца, збіраецца ў начны паход. Непрыкметнай сцежкай крочаць наперад біёлагі. Узнікае песня, але неўзабаве сціхае. Бо вельмі ўжо цудоўная прырода вакол. Сырадоем сцелецца над возерам туман. Цішыня. Сцежка прывяла на «балкончык», нібы спецыяльна зроблены прыродай на беразе. Прыціхлі ля кастра размовы. І раптам... вялізны чырвоны шар вынырнуў з возера, прарваў сетку тумана і заскакалі па вадзе месячныя блікі. «Прыгажосць жа якая!» І, як заварожаныя, мы глядзім і не можам наглядзецца...

Ж. ЛЯХАВА.

# Справаздачы і выбары ў партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацыях

У верасні—кастрычніку будуць праходзіць справаздачы і выбары ў партыйнай, а таксама ў камсамольскай і прафсаюзнай арганізацыях універсітэта. Гэта асабліва важны перыяд у жыцці грамадскіх арганізацый, да якога неабходна падрыхтавацца ўважліва, улічыць недахопы мінулых гадоў, зрабіць усё для таго, каб сходы ў групах, на курсах і факультэтах прайшлі арганізавана, з высокай актыўнасцю камуністаў, камсамольцаў і членаў прафсаюза, з сапраўднай дзелавітасцю, вострай крытыкай і самакрытыкай, з захаваннем усіх патрабаванняў Статута КПСС пры абмеркаванні важнейшых пытанняў дзейнасці партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый факультэтаў і адміністрацыйна-гаспадарчай часткі. Усё гэта будзе садзейнічаць павышэнню ролі гэтых арганізацый у вучэбнай, навукова-даследчай і палітыка-выхаваўчай рабоце сярод студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў, вылучэнню да кіраўніцтва партыйнымі, камсамольскімі і прафсаюзнымі арганізацыямі найбольш здольных, энергічных, аўтарытэтных і ініцыятыўных таварышаў.

Вясной гэтага года пытанне аб рабоце парткома ўніверсітэта абмяркоўвалася на бюро Мінскага прамысловага абкома КПБ. У прынятым рашэнні адзначаны сур'ёзныя недахопы ў ідэалагічнай рабоце партыйнай і камсамольскай арганізацый сярод студэнцкай моладзі. Цяпер пачаўся новы навучальны год, і многія справы трэба вырашаць не марудзячы, больш глыбока, цікава, арганізавана, поўнасцю выканаць намечаныя мерапрыемствы. У справаздачных дакладах, выступленнях і рашэннях неабходна глыбока прааналізаваць работу партыйных і камсамольскіх арганізацый па выкананню пастановы бюро Мінскага прамысловага абкома КПБ.

Неабходна асаблівую ўвагу звярнуць на ўзмацненне індывідуальнай работы з кожным студэнтам, павышэнне ролі партыйных і камсамольскіх груп, грамадскіх арганізацый курсаў, партыйнага, камсамольскага і прафсаюзнага актыву, а таксама прафесарска-выкладчыцкага складу ў жыцці, вучобе студэнтаў, выхаванні іх у духу высокай ідэйнасці і глыбокага разумення свайго грамадскага абавязку.

Відаць, варта, каб у ходзе справаздач і выбараў быў абагульнены і выкарыстаны станоўчы вопыт у рабоце. Нямала цікавых і карысных спраў правяла паргарганізацыя гістарычнага факультэта, добрыя прыклады маюцца на матэматычным, хімічным і іншых факультэтах. Ва ўніверсітэце працуюць дзесяткі і сотні сапраўдных актывістаў, энтузіястаў з ліку студэнтаў, выкладчыкаў, чый вопыт заслугоўвае ўсямернага распаўсюджвання і заахвочвання.

Цяпер, дзякуючы нястомным клопатам партыі і ўрада аб адукацыі народа, аб развіцці навукі, наш універсітэт ператварыўся ў буйнейшую ВНУ рэспублікі, у сценах якой займаюцца прадстаўнікі многіх народаў не толькі СССР, але і некаторых замежных краін. З кожным годам усё больш і больш узмацняецца і ўдасканальваецца навукова-тэхнічная і вучэбная база ўніверсітэта, папаўняюцца прафесарска-выкладчыцкія кадры і г. д. Адным словам, наша студэнцтва мае ўсё неабходнае для паспяховай вучобы.

У гэтых умовах значэнне грамадскіх арганізацый універсітэта, самадзейнасці студэнтаў цяжка пераацаніць.

Справаздачы і выбары ў партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацыях павінны прайсці пад знакам далейшага паляпшэння іх работы, узмацнення іх ролі ў жыцці шматтысячнага калектыву студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта.

**А. Я. БУРАЎСКІ,**
сакратар партыйнага камітэта.

## НОВЫЯ ПЛАНЫ РАБОТЫ

*На чарговым пасяджэнні ўніверсітэцкай групы садзейнічання партыйна-дзяржаўнаму кантролю члены групы пазнаёміліся з Палажэннем аб групах і пастах садзейнічання партыйна-дзяржаўнаму кантролю і намецілі план работы групы на бягучы навучальны год. У плане, у прыватнасці, прадугледжаны такія пытанні: аб грамадскім харчаванні ў БДУ; аб стане эксперыментальных баз на возеры Нарач і ў Красным Урочышчы; аб падрыхтоўцы навуковых кадраў праз аспірантуру; аб прафесарска-выкладчыцкіх кадрах на завочным факультэце.*

# „ЦІШЭЙ, ІДУЦЬ ЭКЗАМЕНЫ"

Да такіх аб'яў мы прывыклі. Яны з'яўляюцца на дзвярах аўдыторый на працягу ўсяго навучальнага года. Вось і цяпер больш за сто чалавек трымаюць конкурсныя экзамены ў аспірантуру.

Наш карэспандэнт пабываў у групе, якая здавала ўступныя экзамены па абраных спецыяльнасцях: гісторыі філасофіі, логіцы, асновах марксісцка-ленінскай эстэтыкі, этыцы, асновах навуковага атэізму. Вось што ён паведаміў.

Экзамены трымалі ў асноўным людзі з вялікім стажам практычнай работы ў навукова-даследчых інстытутах, у камсамольскіх органах, у выдавецтвах. Некаторыя паступаюць са здадзеным мінімумам па 1—2 прадметах, маюць друкаваныя працы.

У цэлым па ўзроўню агульнай і спецыяльнай падрыхтоўкі папаўненне ідзе добрае. Парадавалі выкладчыкаў сваімі адказамі па эстэтыцы малодшы навуковы супрацоўнік інстытута мовазнаўства АН БССР В. В. Качаноўскі, літработнік часопіса «Камуніст Беларусі» Л. А. Гарбунова і іншыя. Загадчык кафедры гісторыі філасофіі і логікі прафесар І. М. Лушчыцкі асабліва высока ацаніў адказы першага сакратара Ленінскага райкома ЛКСМБ В. Ф. Беркава (па логіцы) і старшага рэдактара выдавецтва АН БССР З. П. Давідовіч (па эстэтыцы).

# РАПАРТУЕ „АЭЛІТА"

Студэнцкі будаўнічы атрад фізфака, які працуе ў саўгасе «Алгабаскі», да пачатку навучальнага года выканаў свае дагаворныя абавязацельствы на 140 працэнтаў.

Здадзены ў эксплуатацыю матэрыяльна-тэхнічны склад, зерняток, дзве кашары, жылы дом. Праведзена сем «ударнікаў» па аказанню дапамогі саўгасу ва ўборцы ўраджаю. Будуюцца кароўнік, насеннесховішча, гароднінасховішча, аптэка, тры хлявы. Нарыхтавана 120 тысяч штук саманных цаглін.

Пры атрадзе працуюць: група садзейнічання партыйна-дзяржаўнаму кантролю, пост камсамольскага пражэктара, піянерскі лагер «Спадарожнік», народная дружына, спартыўныя секцыі: футбольная, валейбольная, баскетбольная, цяжкай атлетыкі, барацьбы.

За час, які астаўся да ад'езду, мы сталі на ўдарную працоўную студэнцкую вахту і ўзялі абавязацельства выканаць план на 180 працэнтаў.

**Анатоль ТУШЫНСКІ,**
**студэнт 3-га курса фізфака.**

# У партыйным камітэце ўніверсітэта

* * *

Партыйны камітэт універсітэта абмеркаваў пытанне аб падрыхтоўцы да 100-годдзя І Інтэрнацыянала. Гэтай падзеі будзе прысвечана навукова-тэарэтычная канферэнцыя. Выкладчыкі і студэнты прымуць актыўны ўдзел у чытанні лекцый і дакладаў сярод працоўных рэспублікі. Вырашана таксама падрыхтаваць у бібліятэцы і ў вучэбных кабінетах спецыяльныя выстаўкі літаратуры, ілюстраваныя выстаўкі.

* * *

Устаноўлена Дошка Пашаны ўніверсітэта. На яе будуць заносіцца імёны выдатнікаў вучобы, лепшых актывістаў і работнікаў па прадстаўленню партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый сумесна з кіраўніцтвам факультэтаў.

* * *

Цудоўнай традыцыяй калектыву ўніверсітэта стала сістэматычная дапамога школам рэспублікі ў вучэбна-педагагічнай і выхаваўчай рабоце. Днямі па рашэнню парткома створаны агульнаўніверсітэцкі савет дапамогі школе і сям'і. Савет узначаліў загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі дацэнт Сцяпан Андрэевіч Умрэйка.



# Так пачаўся „УЗЛЁТ"

У мінулы панядзелак адбылося арганізацыйнае пасяджэнне літаратурнага аб'яднання, якое створана пры газеце «Беларускі ўніверсітэт». Верыцца, што закладзены добрыя асновы для вялікага, цікавага жыцця аб'яднання.

Пасяджэнне адкрыў прафесар М. Р. Ларчанка. Гэта ён прапанаваў даць імя аб'яднанню, імя, якое многаму абавязала б кожнага, хто прыйдзе за парадай. Успомнілі гісторыю аб'яднанняў беларускіх літаратараў, адначасова былі вызначаны прынцыпы работы пачынаючых паэтаў і пісьменнікаў. «Узлёт» — вось як рашылі назваць новае аб'яднанне. «Узлёт»—так будзе называцца рукапісны альманах. «Узлёт» — гэта слова ўпрыгожыць вокладку членскага білета гуртკоўца.

«Узлёт» ужо выходзіць на арбіту. Па прапанове паэтаў, выкладчыкаў універсітэта Н. С. Гілевіча і А. А. Лойкі студэнты рашылі на працягу тыдня абмеркаваць і адабраць вершы для літаратурнай старонкі газеты «Беларускі ўніверсітэт». Гэта будзе першы дэбют членаў літаратурнага аб'яднання.

Наступнае пасяджэнне адбудзецца ў рэдакцыі газеты (пакой № 212) 22 верасня а 15-й гадзіне. Запрашаюцца ўсе аматары літаратуры з усіх факультэтаў універсітэта і з іншых ВНУ горада. Мы падкрэсліваем апошнія словы таму, што на першым пасяджэнні прысутнічалі ў асноўным студэнты-філолагі. «Узлёт» жа кліча ў сваю творчую лабараторыю ўсіх.



ДВОЕ І МОРА.

Фотаэцюд В. Луцэнкі.

*Гэтыя здымкі зроблены ў час вытворчай практыкі біёлагаў на возеры Нарач. На верхнім здымку: ля студзёнага калодзежа. На здымку ўнізе: «трафей» заолагаў — філін.*

Фота выкладчыка **В. Янушэўскага.**



# ТРЫ ІНТЭРВ'Ю АБ АДНЫМ ВЕЧАРЫ

Сустрэчы студэнтаў-першакурснікаў са студэнтамі і выкладчыкамі сталі добрай традыцыяй пачатку кожнага навучальнага года. Вось і ў мінулую суботу галоўная актавая зала стала арэнай пасвячэння ў студэнты новай арміі першакурснікаў. Мы з гэтага выпадку ўзялі тры інтэрв'ю для газеты «Беларускі ўніверсітэт». Прапануем вам іх.

**Таня БРАНАВЕЦ,** першакурсніца аддзялення беларускай мовы і літаратуры: «Хвалюючыя словы выкладчыкаў, якія заклікалі нас, першакурснікаў, наперад, да авалодання вяршынямі навукі, надоўга застануцца ў маёй памяці. Я ганаруся, што стала студэнткай ВНУ, якая мае такую багатую гісторыю».

***Жазеф* НГАНДУ,** кангалезец, студэнт філалагічнага факультэта: «Я не ўпершыню прысутнічаю на студэнцкіх вечарах, і з кожным разам усё больш пераконваюся ў шчырасці савецкай моладзі. Няхай квітнее дружба паміж моладдзю ўсіх краін. Я вітаю Сусветны форум салідарнасці моладзі і студэнтаў, які не выпадкова праводзіцца менавіта ў сталіцы вашай цудоўнай краіны».

**А. А. ВОЛК,** сакратар партбюро філалагічнага факультэта: «Мне думаецца, што сустрэчы першакурснікаў са старшакурснікамі сталі вельмі нядрэннай традыцыяй нашага ўніверсітэта. Было б добра наладжваць часцей сустрэчы малодшакурснікаў з ветэранамі БДУ, падрабязна пазнаёміць іх са слаўнай гісторыяй універсітэта».

**В. АДЗІЯН,**

**М. ШЫМАНСКІ.**


Рэдактар **М. ІОСЬКА.**

**Адрас рэдакцыі:**

г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 03719. Тыр. 2000. Зак. 3363.